# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ. КРЫНІЦАЗНАЎСТВА І МЕТАДЫ ГІСТАРЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

*А. А. ГУЖАЛОЎСКІ*

## ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ І ЭТНАГРАФІЧНАЕ МУЗЕЯЗНАЎСТВА: СПРОБА ВЫЗНАЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯЎ

У артыкуле абмяркоўваецца думка пра неабходнасць тэарэтычнага асэнсавання практычнай дзейнасці беларускіх музеяў этнаграфічнага профілю, калі яны апынуліся перад шматлікімі выклікамі ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі са сродкамі масавай інфармацыі і забаўляльнымі ўстановамі. На аснове рэтраспектыўнага аналізу, а таксама крытыкі сучаснай музейнай дзейнасці аўтар вылучае вузлавыя праблемы, якія стаяць перад беларускімі этнаграфічнымі музеямі, а таксама прапануе дэфініцыі тэрмінаў «этнаграфічны музей» і «этнаграфічнае музеязнаўства». Указваецца на неабходнасць адаптацыі дадзеных тэрмінаў да існуючай нацыянальнай музейнай практыкі.

The article is an attempt to formulate the idea of necessity of theoretical comprehension of the Belarusian ethnological museums practice. This necessity is proved by the challenges facing contemporary Belarusian museums including their strong competition with mass media and entertainment institutions. On the basis of retrospective analysis as well as contemporary museum activity criticism an author singles out key problems which require quick solution from Belarusian museums of ethnology. The definitions of terms «museum of ethnology» and «ethnological museology» are offered in the article. It is emphasized the need to adapt these terms to contemporary national museum practice.

*Ключавыя словы*: этнаграфія, музей, музеязнаўства, культурная спадчына.

*Keywords*: Ethnography, museum, museology, cultural heritage.

---

**Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч** — прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук.

Тэма гэтага артыкула нарадзілася ў выніку шматлікіх размоў з калегамі па кафедры — этнолагамі і антраполагамі, падчас якіх абмяркоўваліся каштоўнасныя сістэмы беларускіх этнаграфічных музеяў, вызначалася іх месца ў сістэме навук, рабіліся пошукі свядомага і падсвядомага ў мінулых і сучасных этнаграфічных экспазіцыях. Вынікам падобнай музейна-этнаграфічнай рэфлексіі была канстатацыя наступнага факта: на пачатку XXI ст. беларускія этнаграфічныя музеі знаходзяцца перад неабходнасцю карэкціроўкі тактыкі і стратэгіі сваёй дзейнасці, што выклікана зменамі, якія адбываюцца ў навакольным свеце. Гэтыя змены сёння вызначаюць агульныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы, такія як выкарыстанне ў музейнай практыцы навейшых тэхналогій, укараненне музеяў — некамерцыйных па статусе ўстаноў — у рынкавую эканоміку, а таксама змяненне і пашырэнне традыцыйных сфер музейнай дзейнасці.

Усё гэта, безумоўна, тычыцца таксама музеяў этнаграфічнага профілю. Але ў апошніх ёсць уласная сфера кампетэнцыі ў музейнай супольнасці, спецыфічная місія, якую можна вызначыць як фарміраванне культурнай самаідэнтыфікацыі грамадства, а таксама талерантнага стаўлення яго прадстаўнікоў да іншых культур. Складанасць гэтай місіі выклікала да жыцця этнаграфічнае музеязнаўства, якое ў суседніх краінах ужо стала аб’ектам спецыяльнага навуковага вывучэння [2, 5, 9, 12], прадметам выкладання ва ўніверсітэтах (напрыклад, на кафедры этналогіі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта), а таксама напрамкам практычнай дзейнасці (напрыклад, у Цэнтры этнаграфічнага музеязнаўства Расійскага этнаграфічнага музея ў Пецярбургу).

У Беларусі практычныя работы па збіранні, вывучэнні і папулярызацыі этнаграфічных калекцый у музеях пакуль што не сталі аб’ектам сур’ёзнага навуковага аналізу. Вызначэнні базавых тэрмінаў «этнаграфічны музей» і «этнаграфічнае музеязнаўства» дарэмна шукаць нават у галіновай энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» [11]. Між тым практычны вопыт, назапашаны нашымі папярэднікамі ў галіне этнаграфічнага музеязнаўства, варты таго, каб зрабіць яго падмуркам для сучасных даследаванняў рэтраспектыўнага і тэарэтычнага характару. Інакш кажучы, назапашаны практычны вопыт патрабуе гісторыка-тэарэтычнага абагульнення, а праз яго — выхад на якасна новы ўзровень практычнай дзейнасці.

На беларускіх землях першыя спробы збірання і прэзентацыі этнаграфічнага матэрыялу ўжо напрыканцы XVIII ст. зрабіла Г. Ябланоўская. Вядома, што ў яе прыватным зборы, што знаходзіўся ў Семяцічах, мелася

адзенне, зброя, упрыгожанні прадстаўнікоў экзатычных культур, што ўкладалася ў рэчышча еўрапейскай традыцыі эпохі каланіялізму. Першым публічным музеем, дзе ў сярэдзіне XIX ст. пачалося збіранне беларускага этнаграфічнага матэрыялу, быў Віленскі музей старажытнасцей. Традыцыю прыватнага збірання і вывучэння этнаграфічнай спадчыны ў той час працягвалі К. Тышкевіч у Лагойску, А. Ельскі ў Замосці, І. Луцкевіч у Вільні і інш. На працягу першай паловы ХХ ст. этнаграфічныя калекцыі зрабіліся неад’емнай часткай фондавых збораў амаль усіх гісторыка-краязнаўчых музеяў Беларусі. Да ліку лепшых з іх адносіліся Беларускі музей І. Луцкевіча ў Вільні (у 1930-я гг. набыў афіцыйную назву «Беларускі гісторыка-этнаграфічны музей») і Беларускі дзяржаўны музей у Менску [3].

Традыцыі беларускага этнаграфічнага музеязнаўства, закладзеныя І. і А. Луцкевічамі, В. Ластоўскім, шматлікімі краязнаўцамі 1920-х гг., былі працягнуты музеямі Беларусі ў пасляваенны час. Важнымі ў навуковых адносінах этнаграфічнымі калекцыямі валодаюць Нацыянальны гістарычны музей, абласныя і раённыя краязнаўчыя музеі. З’явіліся спецыялізаваныя музеі, якія ставяць задачы вывучэння і інтэрпрэтацыі этнаграфічнай спадчыны ў нацыянальным (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту) і рэгіянальным (Магілёўскі музей этнаграфіі) маштабах. Іх калекцыі і экспазіцыі наяўна, прадметна сцвярджаюць каштоўнасць нацыянальнай культурнай традыцыі. Аднак і сёння працэсы камплектавання і сістэматызацыі этнаграфічных калекцый, а таксама запатрабаванасць, актуальнасць нацыянальнай этнаграфічнай спадчыны ў музеях выклікаюць шмат спрэчных пытанняў.

Ужо першыя захавальнікі этнаграфічных музеяў сутыкнуліся з пытаннем: як сістэматызаваць і групаваць сабраныя прадметы? Кожны захавальнік вырашаў гэтую праблему па-свойму, пад уплывам навуковых дасягненняў свайго часу і выкарыстоўваючы спадчыну сваіх папярэднікаў. Спосабы вырашэння гэтай праблемы вызначалі асаблівасці этнаграфічных музейных збораў, фарміруючы іх індывідуальнасць.

Напрыклад, у першай вядомай нам музейнай інструкцыі па камплектаванні этнаграфічных калекцый, складзеных В. Ластоўскім у 1927 г., мы чытаем: «...пажадана, каб рэч, якая паступае ў музей, зьяўлялася тыповай для данай мясцовасьці, мела на сябе адзнакі найбольшага дасягненьня народнай тэхнікі і, адначасова, была мастацкай формы або аздоблена ўкрасамі. Толькі такім чынам укамплектаваны этнаграфічны музэй будзе мець навуковую і культурную вартасьць» [7, с. 209]. Такім чынам, В. Ластоўскі прапануе тры крытэрыя камплектавання: 1) крытэ-

рый тыповасці; 2) крытэрый самабытнасці; 3) крытэрый мастацкай вартасці. Далей, у тэксце інструкцыі ён дадае яшчэ адзін крытэрый: «У этнографічны музэй павінны паступаць толькі рэчы жывой старасьветчыны» [7, с. 215]. Інструкцыя прадугледжвала, што этнаграфічны збор музея павінен складацца з наступных калекцый: 1) тканіна; 2) вышыўкі; 3) антуляжы; 4) карункі і фарбота; 5) ганчарныя вырабы; 6) вырабы з металаў; 7) вопратка; 8) дзіцячыя цацкі; 9) вырабы з бяросты; 10) маляванне на дрэве; 11) звёзды і батлейкі; 12) саламяныя павукі; 13) набойкі [7, с. 209]. Бачна, што ў аснову гэтай небездакорнай з сённяшняга пункту гледжання класіфікацыі пакладзены два крытэрыя — матэрыялу і віду мастацтва.

З тых далёкіх часоў музейная этнаграфія сфарміравала ўласную традыцыю класіфікацый і таксаномій (іерархій) народаў, культур, арэалаў, прадметаў. Сам этнаграфічны музей пачаў разглядацца як прастора нараджэння разнастайных, гістарычна абумоўленых класіфікацый. У яго сценах увесь час ідзе працэс фарміравання новых культурных значэнняў і этнаграфічных рэалій праз перагрупоўку і перайменаванні рэчаў, стварэнне калекцый і экспазіцый. Сёння кажуць пра ўплыў асоб і інстытуцый на этнаграфічныя калекцыі і абмяркоўваюць, як інтэрпрэтацыі этнаграфічнага збору залежаць ад іх. Прыёмы класіфікацыі і сістэматызацыі матэрыялу ў розных культурах вывучаюцца спецыяльна, этнасістэматыку разумеюць як субдысцыпліну. З аднаго боку, прыёмы сістэматызацыі прадметаў матэрыяльнай культуры і розных этнічных з’яў у навуцы змяняліся на працягу яе развіцця, з другога — яны адрозніваліся ад сістэматызацыі прадметаў і з’яў у культуры іх стваральнікаў. Які шлях павінен абраць музей — групаваць сваі прадметы так, як гэта зрабілі б іх стваральнікі і носьбіты дадзенай культуры, альбо выкарыстоўваць сучасныя навуковыя катэгорыі? Пытанне аб прынцыпах класіфікацыі этнаграфічных калекцый у музеі — гэта пытанне аб узаемаразуменні культур. Бо, не ведаючы ўмоў стварэння прадметаў і арыгінальнага асяроддзя іх бытавання, немагчыма гэтыя прадметы зразумець [1, с. 26].

Крытэрыі і прынцыпы прэзентацыі ў экспазіцыях этнаграфічных калекцый таксама змяняліся пад уздзеяннем розных навуковых парадыгм. У розныя часы этнаграфічныя музеі прапаноўвалі публіцы эвалюцыяніцкія і культурна-гістарычныя, этнацэнтрысцкія і мультыкультурныя экспазіцыі. Акрамя навуковых ідэй, за этнаграфічнымі экспазіцыямі заўсёды стаялі нейкія палітычныя альбо культуралагічныя памкненні. Нават калі стваральнікі калекцый і экспазіцый іх свядома не ар-

тыкулявалі. На працягу свайго існавання этнаграфічныя музеі адстойвалі каланіяльную дактрыну альбо абвяшчалі вайну каланіялізму, прасоўвалі расавую ідэю альбо змагаліся супраць дыскрымінацыі, хавалі мясцовыя культурныя асаблівасці дзеля ўмацавання нацыянальнага адзінства альбо ўмацоўвалі мясцовыя ідэнтычнасці, прысвойвалі чужыя культуры альбо дэманстравалі толькі адну з сацыяльных культур, прэзентуючы яе як агульнанацыянальную [10, с. 24].

Агульнапрызнана, што этнаграфічная музейная экспазіцыя мае вялікі аўтарытэт і большую ступень даверу грамадства, чым аналагічны друкаваны тэкст. Этнаграфічныя экспазіцыі дазваляюць людзям асэнсаваць уласную нацыянальную і рэгіянальную ідэнтычнасць, адбудаваць апазіцыю «свой — чужы» праз глыбокія эмацыйныя перажыванні [8]. На працягу доўгага часу гэтая мяжа ў беларускіх савецкіх этнаграфічных экспазіцыях была праведзена так, што ў катэгорыю «чужых» траплялі не толькі нацыянальныя меншасці, але і прадстаўнікі «варожых» сацыяльных груп і класаў. Падобная мяжа была ўсталявана з дапамогай прыёму замоўчвання, калі ўлада вызначала, што трэба ведаць наведвальнікам, а што — не. Практыка інтэрпрэтацыі этнаграфічных помнікаў у савецкіх музеях, у якой дзіўным чынам спалучаліся навуковыя і ідэалагічныя падыходы, стварыла традыцыю, альбо, як сказаў бы М. Фуко, дыскурс, даволі далёкі ад рэальнасці.

Гэты дыскурс яшчэ прасочваецца ў шэрагу сённяшніх беларускіх этнаграфічных экспазіцый, дзе вясковая культура паказана прыўкрашанай, ідэалізаванай, ізаляванай ад знешніх уплываў. У сённяшніх музеях цяжка знайсці прысутнасць прадстаўнікоў гістарычна склаўшыхся нацыянальных супольнасцей Беларусі. Тым, хто пажадае гэта зрабіць, трэба накіроўвацца ў Веткаўскі музей народнай творчасці альбо Рэчыцкі гісторыка-краязнаўчы музей, дзе ў стацыянарных экспазіцыях можна азнаёміцца з мастацтвам і побытам рускіх старавераў. Інфармацыю пра культуру яўрэяў і татар Беларусі пакуль што трэба шукаць на часовых выставах: у Іўеўскім музеі нацыянальных культур («Рэлігія і лад жыцця беларускіх яўрэяў», 2010; «Татары Іўеўшчыны — праз стагоддзі ў будучыню», 2010), у Музеі гісторыі Клеччыны («Яўрэйская крама», 2005), у Лідскім гісторыка-краязнаўчым музеі («Прывітанне, старая Ліда», 2010). Да аб'ектыўных праблем, звязаных з недахопам рэчавага матэрыялу, перад стваральнікамі гэтых экспазіцый паўставалі праблемы этычнага характару. Адна з іх звязана з удзелам у стварэнні падобных экспазіцый прадстаўнікоў тых нацменшасцей, пра якіх ідзе экспазіцыйны аповед. Няма ў беларускіх музеях аніякай інфармацыі пра этнічныя суполкі (афган-

скую, армянскую і інш.), якія складаюцца ў Беларусі на нашых вачах у апошнія два дзесяцігоддзі. Адсутнічаюць у этнаграфічных экспазіцыях раздзелы, прысвечаныя трансфармацыі традыцыйнай беларускай культуры (і культур нацменшасцей) у наш час.

Нялёгка сёння знайсці музейнаму наведвальніку таксама раздзелы, прысвечаныя гарадской культуры Беларусі, з дапамогай якіх можна было б скласці ўяўленне пра паўсядзённае жыццё гарадоў. Вынікам гэтага з'явілася тое, што для большасці жыхароў краіны ўласная гарадская культура нават даваеннага часу — невядомая, а гэта значыць чужая. Да нешматлікіх спроб пераламіць гэтую заганную традыцыю трэба аднесці раздзел «Магілёў губернскі» ў сталай экспазіцыі Магілёўскага этнаграфічнага музея, а таксама выставачныя праекты, рэалізаваныя ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь («Гарадскі быт XIX — пачатку XX ст.»), Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным запаведніку («Прагулка па Ніжне-Пакроўскай»).

Між тым традыцыйнае грамадства і яго культура ў Беларусі трансфармуецца сёння ў грамадства масавага спажывання, для якога ўласціва ўрбаністычная культура. Традыцыйная культура пераўтвараецца ў элемент сыходзячага мінулага, частку экзотыкі, якая існуе па-за межамі вялікага горада, дзе знаходзіцца этнаграфічны музей. Асноўная маса наведвальнікаў — моладзь — мае ўяўленне аб этнічных аспектах культуры з падручнікаў, фільмаў, мастацкай літаратуры. Яны не адчуваюць асабістай сувязі з культурай, прадстаўленай у этнаграфічных экспазіцыях. Што можа прапанаваць этнаграфічны музей моладзі, якая вырасла ў асяроддзі індустрыі забаў і інфармацыйных тэхналогій? Канешне, галоўным аб'ектам этнаграфічных музеяў у блізкай будучыні застанецца па-ранейшаму вясковая сялянская культура. Але яе вывучэнне мае свае межы, і не заўважаць тэм, якія ўзнімаюць сёння антраполагі (субкультуры мегаполісаў, іх мадэлі спажывання, стылі жыцця і інш.), прынамсі на ўзроўні часовых выстаў, надалей немагчыма.

Упэўненасць у здольнасці матэрыяльных аб'ектаў адлюстроўваць навакольны свет такім, якім ён ёсць на самай справе, нарадзілася ў эпоху пазітывізму. Гэту ўпэўненасць падзяляюць большасць прадстаўнікоў музейнай супольнасці Беларусі і сёння. Ілюзія адлюстравання сапраўднай этнаграфічнай рэчаіснасці ўвесь час падтрымліваецца шляхам яе стылізацыі пад фактычнасць. Між тым для таго, каб аўтэнтычны прадмет ператварыўся ў этнаграфічны экспанат, ён павінен прайсці дзве стадыі: 1) дэкантэкстуалізацыі, калі адабраны з побытавага альбо ўжытковага асяроддзя прадмет займае сваё месца ў класіфікацыйнай схеме, якая

запазычана музеем у этнаграфічнай навуцы; 2) нададзенне новага значэння, калі прадмет змяшчаецца ў новую рэальнасць, экспазіцыйны кантэкст. Гэта прымушае нас свядома казаць пра стварэнне аўтарамі экспазіцыі новай мадэлі рэчаіснасці, заснаванай на іх бачанні свету народнай культуры [6].

Сёння ў беларускіх этнаграфічных экспазіцыях прадметы трактуюцца праз іх арыгінальныя значэнні, якія былі ім уласцівы ў арыгінальным асяроддзі бытавання і якія часцей за ўсё ляжаць за межамі самога прадмета. Стварэнне новай этнаграфічнай рэальнасці ў музейных экспазіцыях адбываецца шляхам выкарыстання двух класічных прыёмаў: а) абстановачныя сцэны, калі пэўныя этнаграфічныя рэаліі — абрады, рамёствы, інтэр’еры і г. д. — у дэталях аднаўляюцца (імітуюцца) музейнымі сродкамі; б) калекцыйны паказ аднатыпных прадметаў. Да візуальных прэзентацый дадаецца вербальная кантэкстуалізацыя экскурсавода і ў выключных выпадках мультымедыйныя тэхналогіі. Але экспазіцыйную дзейнасць сучаснага этнаграфічнага музея (як і музеяў іншых гістарычных профіляў) варта разумець у рамках дыхатаміі «музей рэчаў — музей ідэй». Беларуская сучасная экспазіцыйная практыка сведчыць, што пры абмежаванасці кола аўтэнтычных рэчаў у нас існуе таксама недахоп прадуктыўных ідэй.

Асобная праблема сучаснай экспазіцыйнай музейнай практыкі — гэта вызначэнне і інтэрпрэтацыя эстэтычнай каштоўнасці этнаграфічнага прадмета. Каштоўныя творы народнага мастацтва арганічна ўвайшлі ў экспазіцыі музеяў і галерэй (напрыклад, выстава «Маляваныя дываны Я. Драздовіча» ў Заслаўскім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, 2010). Мастакі і дызайнеры не раз спрабавалі прадставіць этнаграфічныя прадметы ў розных інсталяцыях як самадастатковы твор мастацтва альбо як арт-аб’ект. Спасылаючыся на культурную абумоўленасць пачуцця прыгожага, сёння робяцца спробы ўжываць падобныя экспазіцыйныя практыкі ў этнаграфічнай экспазіцыйнай прасторы. Прадаўнікі гэтага падыходу ставяць пытанне аб захаванні дысцыплінарных (этнаграфічных) меж музея, засцерагаючы, што ўжыванне трактовак твораў выяўленчага мастацтва да этнаграфічных прадметаў змяняюць прыроду этнаграфічных экспазіцый, і калі магчыма, то ў вельмі абмежаваных выпадках.

Яшчэ адна праблема — гэта персаніфікацыя, індывідуалізацыя этнаграфічных экспазіцый, акцэнт на асобу. Агульнавядома, што наведвальнік імкнецца атрымаць у музейнай экспазіцыі асабісты вопыт і асабістае ўражанне. Лепшыя музеі даюць задавальненне гэтаму памкнен-

ню, раскрываючы свет асобнага чалавека, насуперак склаўшымся падыходам да паказу з дапамогай калекцый культуры ўвогуле. Калі традыцыйныя этнаграфічныя экспазіцыі распавядаюць пра народы і рэгіёны, то наватарскія музеі спрабуюць знайсці асаблівае вымярэнне, раскрыць асобу ў культуры, эмоцыі і хваляванні «простых» людзей, логіку іх паўсядзённых паводзін (напрыклад, адукацыйныя праграмы, што праводзяцца на экспазіцыі «Хата завозніка» ў Заслаўскім гісторыка-культурным музеі-запаведніку).

У цэлым сённяшнія беларускія этнаграфічныя музеі, а таксама этнаграфічныя раздзелы экспазіцый краязнаўчых музеяў за нешматлікімі выключэннямі канцэптуальна ўзнаўляюць нейкую ідэальную мадэль беларускай сялянскай культуры, «этнаграфічнага мінулага» XIX — пачатаку XX ст. (класічны прыклад — Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту). Гэтая мадэль прэтэндуе на цэласнае апісанне, якое ўключае абавязковы набор характарыстык асноўных заняткаў, рамёстваў, промыслаў, паселішчаў, жытла, начыння, адзення, абрадавых практык, народнага мастацтва. Яна стварае ў наведвальнікаў вобраз статычнага грамадства, на якое не ўплывалі знешнія і ўнутраныя фактары, мадэрнізацыйныя працэсы, міграцыі і інш. У пэўным сэнсе этнаграфічныя калекцыі ў нашых музеях, паўстаўшыя ў другой палове XX ст., мы можам разглядаць ужо як помнікі, факты гісторыі этнаграфічнай навукі Беларусі.

Між тым ужо ў бягучым стагоддзі сучасная музейная этнаграфія атрымала новыя моцныя імпульсы ў сваім развіцці. Першае дзесяцігоддзе XXI ст. было часам самарэфлексіі і рашучых змен у буйнейшых этнаграфічных музеях Еўропы. Яны ўвасобіліся ў рэалізацыі такіх буйных праектаў, як Нацыянальны музей этналогіі ў Лейдэне (Нідэрланды, 2001), Музей культур свету ў Гётэборгу (Швецыя, 2004), Музей цывілізацый на ўзбярэжжы Бранлі, Парыж (Францыя, 2006), Музей міграцый (Швейцарыя, у стадыі рэалізацыі) [4]. Гэтыя музеі — ужо не папулярызатары навукі, а ўдзельнікі працэсу вытворчасці разнастайных відаў самасвядомасці, новай еўрапейскай культурнай ідэнтычнасці. Яны даюць магчымасць далучыцца да здабыткаў уласнай культуры прадстаўнікам розных слаёў грамадства, асэнсаваць самакаштоўнасць сваёй культуры і, тым самым, браць на сябе заботу аб уласным будучым. Адныя з гэтых музеяў праз паказ калекцый імкнуцца прадставіць такія ўніверсальныя паняцці, як праца, багацце, прыгажосць, гвалт. Іншыя бачаць галоўную задачу інтэрпрэтацыі этнаграфічнага матэрыялу ў раскрыцці сутнасці ўзаемаўплыву культур і міграцыі народаў. Заўважым таксама, што ў на-

звах сучасных музеяў, распавядаючых пра народныя культуры, няма тэрміна «этнаграфія», які лічыцца састарэўшым, «каланіяльным». Замест яго выкарыстоўваюцца такія паняцці, як «этналогія», «культура», «цывілізацыя».

Падсумоўваючы вышэйсказанае, магчыма прапанаваць наступнае вызначэнне тэрміна «**этнаграфічны музей**»: *«профільная група музейных устаноў, якія дакуменціруюць этнагенез народаў і іншых этнічных еднасцей, іх культуру шляхам збірання, захавання, вывучэння і папулярызацыі этнаграфічных калекцый»*. На філасоўскім узроўні сэнс дзейнасці сучаснага этнаграфічнага музея можна вызначыць як паказ культурнага адзінства чалавецтва, яго ўзаемазвязанасці ў кантэксце агульнасусветнага прыродна-культурнага працэсу, у якім найвышэйшую каштоўнасць уяўляе працяг жыцця ў яго відавой разнастайнасці. Дарэчы, падобным чынам свае задачы ў другой палове 1930-х гг. фармулявалі стваральнікі славутага Музея чалавека ў Парыжы — Ж.-А. Рыўер, М. Лейрыс і інш. [13].

Этнаграфічны музей — ёсць прадукт этнаграфічнай навукі і адначасова пляцоўка, на якой фарміравалася гэтая навука. Гэта ў значнай ступені абумовіла традыцыйны погляд на этнаграфічны музей як на навукова-дапаможную ўстанову. Аднак сама логіка сучаснага развіцця этнаграфічных музеяў надае ім аўтаномны, самадастатковы грамадскі і навуковы статус. Разуменне этнаграфічнага музея як цэнтра захавання, вывучэння і *фарміравання* этнічных культур, грамадскай думкі і пошуку адказаў на надзённыя праблемы развіцця этнасаў паклікала да жыцця новую дысцыпліну — «**этнаграфічнае музеязнаўства**». Мы разумеем яе як *«спецыяльную сацыяльна-гуманітарную дысцыпліну, якая вывучае як тэарэтычныя, так і практычныя праблемы, частка якіх звязана з этнаграфічнай навукай, а другая мае спецыфічна музейны характар»*. Гэтая дысцыпліна паўстала ў другой палове ХХ ст. на аснове буйных этнаграфічных музеяў былых імперскіх краін, якія стаялі перад праблемай трансфармацыі навуковых і маральна-этычных падыходаў у сваёй дзейнасці. Уяўляецца, што этнаграфічнае музеязнаўства выклікана таксама дапамагчы пераасэнсаваць дзейнасць этнаграфічных музеяў у маладых незалежных краінах, дзе этнаграфічныя калекцыі традыцыйна разумеюцца як сімвалы нацыянальнай годнасці і права на самастойнае развіццё.

Этнаграфічнае музеязнаўства, канешне, не прапануе ўніверсальны рэцэпт паспяховасці этнаграфічнага музея. Кожны этнаграфічны збор — традыцыйны, скансэн, эка-музей альбо жывы музей фарміраваўся, развіваўся і існуе сёння ў індывідуальных умовах. Кожная этнаграфічная

калекцыя і этнаграфічны музей — унікальныя. Чым смялейшыя, разнастайныя і неспадзяваныя будуць абраныя шляхі развіцця этнаграфічных музеяў Беларусі, тым багацейшае будзе калектыўнае разуменне мінулых і сучасных культур. Поспех ляжыць на шляху аптымальнага спалучэння навуковай і сацыяльнай кампаненты ў дзейнасці музея, у якім абавязкова павінны прысутнічаць *асобы* — навуковец, куратар, педагог, мастак і, нарэшце, наведвальнік.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Баранов Д. А.* Этнографический музей и «рационализация системы» // Этнографическое обозрение. 2010. № 4. С. 26—43.
2. *Ботякова О. А.* Музей этнографического профиля в контексте образования и культуры России : автореф. дис. ... канд. культуры. СПб., 2006. 30 с.
3. *Гужалоўскі А. А.* Нараджэнне беларускага музея. Мінск : БДУ, 2001. 106 с.
4. *Вьят Ж.* Этнографические музеи в современном мире // Антропологический форум. 2007. № 6. С. 25—31.
5. *Григорьева Л. І.* Історія вивчення етнічних культур і розвиток музейноі етнографіі Криму у 40-е рр. XIX — поч. XXI ст. : автореф. дис. ... канд. іст. наук. Київ, 2006. 18 с.
6. *Контилайнен Э.-М.* Новые проблемы представления мировых культур в музее // Антропологический форум. 2007. № 6. С. 48—56.
7. «Навука» на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі / Беларус. акад. навук. Этнаграфія. Музейная справа / Л. Бабровіч, І. Шпілеўскі, М. Грынблят, А. Ляўданскі. Менск, 1931. Т. 1. Ч. 3.
8. *Семенова В. И.* Отражение современных проблем в этнографической экспозиции // Проблемы музееведения и народная культура. Новосибирск : Наука, 1999. С. 265—282. 283 с.
9. *Турьинская Х. М.* Развитие этнографического музееведения в России в конце XIX — начале XX в. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 2006. 34 с.
10. *Шпирельман В. А.* Музей и конструирование социальной памяти: культурологический подход // Этнографическое обозрение. 2010. № 4. С. 8—26.
11. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мінск : Беларус. савец. энцыкл. імя П. Броўкі. 1989. 575 с.
12. *Barańska K.* Muzeum etnograficzne. Misje, struktury, strategie. Kraków : Wydawnictwo Universytety Jagiellońskiego. 2004. 178 s.
13. *Hudson K.* How Misleading Does an Ethnographical Museum Have to Be? // Exhibiting Cultures. The Poetics and Politics of Museum Display. Ed. by I. Karp and S. Lavine. Washington and London: Smithsonian Institution Press. 1991. P. 457—464.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 17 студзеня 2012 г.